УДК 821.161.3’398.2

**В. В. Мядзведзева**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# КАЗАЧНЫ СЮЖЭТ «МАЧАХА І ПАДЧАРКА» Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны.** Сучаснае беларускае літаратуразнаўства пастаянна звяртаецца да разгляду і ацэнкі тых мастацкіх з’яў, якія сведчаць пра даволі цесную сувязь айчыннага пісьменства з сусветнай традыцыяй. Вядома, што яшчэ ў XIX стагоддзі Аляксандр Весялоўскі, аўтар «Гістарычнай паэтыкі», сцвярджаў існаванне сюжэтаў, якія паўтараюцца ў вуснай народнай творчасці жыхароў розных краін і ў літаратурах розных гістарычных перыядаў. У беларускім казачным эпасе і мастацкай літаратуры бытуе сюжэт «мачаха і падчарка».

**Асноўная частка.** Матыў — найпрасцейшая апавядальная адзінка, якая вобразна адказвала на розныя запыты першабытнага розуму або бытавога назірання. Гэта адна з частак, з якіх складаецца сюжэт.

Матывы сумяшчаюць у сабе элементы міфалогіі і казак: сонца хтосьці выкрадае; шлюбы са звярамі; злая старая даймае прыгажуню; воблакі не даюць дажджу, высахла вада ў крыніцу, бо варожыя сілы закапалі іх, трымаюць вільгаць пад замком, і, каб яе вызваліць, трэба перамагчы ворага і інш. Такога роду матывы маглі зараджацца самастойна ў розных часавых асяроддзях; іх аднастайнасць або іх падабенства нельга растлумачыць запазычаннем, а аднастайнасцю бытавых умоў і псіхічных працэсаў, якія ў іх склаліся.

Сюжэты — гэта паслядоўны малюнак падзей, які можа змяшчаць у сабе розныя матывы, і калі яны больш складаныя, цяжэй прадугледжваць павароты сюжэту. Не ўсе атрыманыя ў спадчыну сюжэты падлягалі абнаўленням; іншыя маглі знікнуць назаўсёды, таму што яны не служылі выяўленню новых духоўных інтарэсаў, іншыя, забытыя, узнікалі зноў. «І матывы, і сюжэты ўваходзяць у абарачэнне гісторыі: гэта формы для выражэння нарастальнага ідэальнага зместу» [1, с. 368].

Да беларускіх народных казак з сюжэтам «мачаха і падчарка» можна аднесці: «Казка пра сіротку Даротку», «Казка пра залатую яблыньку», «Марыся» і інш. У дадзеных казках мачаха, зайздросцячы падчарцы, спрабуе звесці са свету дзяўчыну, бо тая па ўсіх якасцях перасягае і мачаху, і яе дачок. На плечы няшчаснай кладзецца непасільная праца, якую тая выконвае з дапамогай жывёлы-абаронцы ў ролі цялушкі або бычка. Адметнай асаблівасцю казкі «Марыся» з’яўляецца тое, што карову пакінула ў пасаг маці перад смерцю, што робіць ролю гэтай жывёлы яшчэ больш значнай — увасабленнем абароны маці з таго свету.

У першых дзвюх казках мачаха з’яўляецца звычайнай злой кабетай, якая пад канец па дабрыні падчаркі застаецца без кары. Але ў казцы «Марыся» жанчына ўжо аказваецца вядзьмаркай з трэцім вокам. Яе жорстасць пераходзіць усе межы, калі тая топіць падчарку ў рацэ. Кара знаходзіць мачаху амаль адразу. Вядзьмарка памірае ў пакутах пасля месяца хваробы. Тым часам падчарка заўсёды ўвасабляе лепшыя якасці: дабрыня, спачуванне, велікадушнасць. За свае выпрабаванні ў фінале казкі дзяўчына ўзнагароджваецца шчаслівым жыццём з каханым хлопцам.

Сюжэт «мачаха і падчарка» таксама ўласцівы казкам іншых народаў: гэта руская «Марозка», асяцінская «Мачаха і падчарка», татарская «Зухра і месяц», японская «Суніца пад снегам», славенская «Злая мачаха і добрая падчарка» і інш.

Сюжэт у казках іншых народаў з аднаго боку больш складаны. У татарскай казцы «Зухра і месяц» мачаха прыдумала сапраўды цяжкае выпрабаванне: дзяўчынка павінна была запоўніць бочку, якая была без дна і стаяла на калодзежы, што рабіла выпрабаванне невыканальным. У Зухры не было ніякага абаронцы, напрыклад, звыклай цялушкі, як у славянскіх варыянтах. Казка заканчваецца вельмі незвычайна: у дзяўчыну закахаўся малады месяц, загадаўшы тры загадкі, адказам на якія быў ён сам, ён забірае гераіню з сабой на неба: «З тых часоў можна бачыць на месяцы дзяўчыну з каромыслам і вёдрамі. Гэта Зухра шмат-шмат гадоў жыве са сваім месяцам» [3].

А вось у японскай казцы «Суніца пад снегам» прыкметна відавочнае падабенства з аўтарскай казкай С. Я. Маршака «12 месяцаў», крыніцай сюжэту якой была чэшская ці багемская легенда пра дванаццаць месяцаў. О-Цiё мачаха адпраўляе зімой у горы за суніцай дзеля капрызнай сястры. Дзяўчынка сустракае духа, які чароўным чынам прыводзіць яе да сунічніка. Мачаха, расчараваная паспяховым вяртаннем падчаркі, у хуткім часе адпраўляе О-Цiё ўжо за сіняй суніцай: «О-Цiё, О-Цiё! — крычыць ёй мачаха ў самае вуха. — Гэй, ты, слухай, О-Хана не хоча больш чырвоных ягад, хоча сініх. Ідзі жыва ў горы, збяры сіняй суніцы» [4]. У слязах падчарка сустракае духа, які раззлаваўся на такое нахабства мачахі. Аднак зноў прывёў дзяўчынку ўжо да сініх ягад. Мачаха і сястра О-Цiё не могуць спыніцца, ядучы смачную суніцу. Падчарка паспрабавала наставіць іх, аднак яны не паслухалі, думаючы, што тая проста скнарнічае. Мачаха і сястра былі пакараныя: «Бачыць О-Цiё: выраслі ў мачахі і О-Ханы вострыя

© Мядзведзева В. В., 2020



Рэпазіторый БарДУ

вушы і доўгія хвасты. Ператварыліся яны ў рудых лісіц ды так з брэхам і ўцяклі ў горы» [4]. А О-Цiё пражыла шчаслівае жыццё.

Матывы цяжкіх адносін паміж мачахай і падчаркай можна сустрэць не толькі ў народных казках. Яны праяўляюцца ў літаратуры XIX стагоддзя, напрыклад, у баладзе Яна Баршчэўскага «Дзве Бярозы». Немалаважнае месца адведзена ім і ў трылогіі «Палеская хроніка», у рамане «Людзі на балоце».

Мачаха ўжо не зводзіць падчарку са свету. У рамане «Людзі на балоце» жанчына, як і ў сусветна вядомым сюжэце, недалюблівае Ганну, не дае ёй час адпачыць нават на некалькі хвілін: «Яна хацела, мусіць, паглядзецца ў ваду, але з хаты раптам пачуўся нездаволены крык: — Ганно-о! Дзе ты, нячыстая сіла?!. — Я — зараз!.. Нясу ўжэ!.. Дзяўчына заспяшалася, хутчэй зняла вядро з вочапа і, разліваючы на пясок ваду, падалася к хаце... » [2, с. 16].

Аднак нельга недаацаніць, якую ролю адыграла мачаха ў лёсе Ганны і ўсяго твора ў цэлым. Жанчына жыла звычнымі народна-сялянскімі прынцыпамі. Для яе шчасцем, да якога імкнулася, было добрае матэрыяльнае становішча. Менавіта мачаха націснула на дзяўчыну, прымусіла выйсці за некаханага, нават за ненавіснага, закрануўшы сумленне: «— Ну, добра, добра! Не буду, калі не даспадобы!.. Пра нас, пра бацьку падумала б!.. Як яму дажываць век, у нішчымніцы?.. Не малады ўжэ, не тыя часы, калі рабіць мог, ні дня, ні ночы не чуючы. Пакосіць сена да паўдня, дак спіна — крукам, тыдзень потым стогне. Сноп на вілы падыме — рукі, як галінкі сухія, дрыжаць. Скора ўжэ і саўсім на печ ляжа — хто скарынку падасць, старому?.. » [2, с. 242].

Дзяўчына перажыла жудасныя рэчы: пастаянную непавагу з боку новай сям'і і смерць дзіцяці. Нягледзячы на гэта, Ганна захавала, як і абавязвае вобраз падчаркі, высокія маральныя якасці: змагла сысці з ненавіснай сям'і мужа (што было цяжкім крокам у тыя часы) але і не адвярнулася ад мачахі.

**Заключэнне.** Сюжэт «мачаха і падчарка» ўласцівы не толькі фальклорным творам, але і актыўна выкарыстоўваецца ў літаратуры мастацкай. Незалежна ад разгортвання падзей, «падчарка» прадстаўляе толькі дабро, а «мачаха», у большай ці меншай ступені, — зло.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Осьмакова, Л. М.* Хрестоматия по теории литературы : учеб. пособие / Л. М. Осьмакова. — Минск : Просвещение, 1982. — 448 с.
2. *Кабашнікаў, К. П.* Чарадзейныя казкі : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад.: К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч ; рэд. В. К. Бандарчык. — 2-е выд., выпр. і дапр. — Мінск : Беларус. навука, 2003. — Ч. 1. — 639 с.
3. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. — Мінск : Юнацтва, 1981. — 415 с.
4. Зухра и месяц [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://mirckazok.ru . — Дата доступа: 10.10.2019.
5. Земляника под снегом [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://chitalochka-ru.ru . — Дата доступа: 10.10.2019.


УДК 821.161.1

**А. Б. Назаров**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

## КНЯЗЬ МЫШКИН И ИЕШУА ГА-НОЦРИ: СОПОСТАВИМЫ ЛИ ЭТИ ОБРАЗЫ?

Я есмь Пастырь добрый;
Пастырь добрый полагает
жизнь свою за овец
*Евангелие от Иоанна* [4, с. 410]

**Введение.** Из Швейцарии поездом возвращается князь древнего, но обедневшего рода. Князь — Лев Николаевич Мышкин. Выглядит он довольно смешно и нелепо. Заграничные «штиблетики», небольшой узелок вызывают насмешки случайных попутчиков. Князь едет в Россию по «неотложным делам, связанным с наследством» [2, с. 16].

«Теперь я к людям еду; я, может быть ничего не знаю, но наступила новая жизнь» — думает он [2, с. 23]. Пока еще он не понимает, что он возвращается туда, где дух наживы, материальные ценности, дух мещанства, цинизма, кризис христианской веры затмил и поглотил людей, поглотил общество, в котором ещё только предстоит появиться Льву Николаевичу. Герой Достоевского располагает к себе совершенно разных людей: купца Рогожина, семейство Епанчиных, камердинера Алексея. У князя тихий голос, он добр, чистосердечен, готов просто и откровенно отвечать на все вопросы. Внимание, с которым он слушает своих собеседников, — «необыкновенная наивность внимания». С первых страниц романа вырисовывается образ «идеального человека», человека, наделённого великим состраданием, милосердием, добротой.

© Назаров А. Б., 2020



Репозиторий БарГУ